Асноўны клопат катэхэтаў - дабро маладога пакалення

Аўтар: Кінга Красіцкая
17.09.2017 00:00



“Fiunt, non nascuntur christiani” (“Хрысціянамі становяцца, а не нараджаюцца”) - гаварыў вялікі хрысціянскі пісьменнік Тэртуліян. Гэтае выслоўе і сёння не траціць сваёй актуальнасці. З дня ў дзень мы павінны зноў і зноў узрастаць у веры, не забывацца, што маем не толькі цела, але і душу, таму трэба клапаціцца не толькі аб фізічным і інтэлектуальным развіцці, але і, перадусім, аб духоўным. Асабліва гэта датычыць маладога пакалення, ад якога залежаць перспектывы заўтрашняга жыцця. Вялікую ролю ў маральным выхаванні дзяцей і моладзі адыгрываюць катэхеты. Яны з’яўляюцца як быццам працягам рук і вуснаў Хрыста ў справе пашырэння Божага Валадарства. Катэхеты не толькі тлумачаць галоўныя праўды веры, але таксама вучаць адказнасці, працавітасці, шчырасці, любові да бліжняга…

На пачатку новага навучальнага і катэхетычнага года аб ролі і выкліках сучаснай катэхізацыі мы пагутарылі з манахінямі з Кангрэгацыі Сясцёр святой Ядзвігі (ядзвіжанкамі), якія распачалі сваё служэнне ў гродзенскай парафіі Святога Духа. †

– Якую ролю ў маральным выхаванні маладога пакалення адыгрывае сям’я?

Асноўны клопат катэхэтаў - дабро маладога пакалення

Аўтар: Кінга Красіцкая
17.09.2017 00:00



